# Нашы юбіляры

## ЕФРАСІННЯ ЛЕАНІДАЎНА БОНДАРАВА
## (да 75-годдзя з дня нараджэння)



У эпоху электронных тэхналогій, калі камп'ютар замяняе некаторым уласны інтэлект, усё радзей можна сустрэць людзей, якіх з часоў французскіх асветнікаў называюць энцыклапедыстамі. Веданне свайго прадмета і блізкіх галін да самых дробязей, пачынаючы з глыбокай гісторыі, валоданне найбагацейшай інфармацыяй па агульнакультурных пытаннях, здольнасць непрадузята, шырока і фундаментальна падыходзіць да вырашэння няпростых культурных праблем сучаснасці характэрны як для асветнікаў-гуманістаў мінулага, так і для вялікіх вучоных і культурных дзеячоў цяперашняга часу.

Чалавек энцыклапедычных ведаў, выкладчык з моцным асветніцкім патэнцыялам – такой мы ведаем і любім Ефрасінню Леанідаўну Бондараву. Да працы вучонага і педагога доктар філалагічных навук, прафесар Е.Л.Бондарава ставіцца выключна як да Працы з вялікай літары, бо на кожнай лекцыі, пры кожным выпуску вучэбнай газеты, на кожнай навуковай студэнцкай канферэнцыі Ефрасіння Леанідаўна аддае сябе без астатку. Без актыўнага ўдзелу прафесара Бондаравай немагчыма сабе ўявіць пасяджэнне кафедры ці савет факультэта, без яе, наогул, немагчыма ўявіць факультэт журналістыкі. Ефрасіння Леанідаўна – нефармальны, агульнапрызнаны лідэр і аўтарытэт.

Свой журналісцкі шлях Е.Л.Бондарава пачала ў Лёзненскай раённай газеце. У 1945 г. паступіла і ў 1949 г. скончыла Белдзяржуніверсітэт. У 1953 г. абараніла кандыдацкую, а ў 1977 г. доктарскую дысертацыю па праблемах кінакрытыкі.

Е.Л.Бондарава апублікавала шмат навуковых работ, грунтоўнейшых даследаванняў па кінамастацтву, кінасцэнарыі, вялікую колькасць крытычных і публіцыстычных артыкулаў, манаграфіі "Час. Экран. Крытыка", "Экран у розных вымярэннях", "Кінастужка даўжынёю ў жыццё", "Кінематограф і літаратура", а таксама брашуры, вучэбна-метадычныя дапаможнікі.

Доктар навук, прафесар Е.Л.Бондарава – Заслужаны дзеяч навукі Беларусі, член двух творчых саюзаў: журналістаў і кінематаграфістаў, член рэдкалегій Беларускай энцыклапедыі, часопіса "Мастацтва". На працягу доўгага часу Е.Л.Бондарава была старшынёю секцыі кінакрытыкаў Беларусі, членам мастацкага савета кінастудыі "Беларусьфільм", старшынёй метадычнага савета Рэспубліканскага Дома кіно.

Прафесар Бондарава – гэта гісторыя журфака і яго сучаснасць. Зараз, з нагоды юбілею Ефрасінні Леанідаўны, калегі, выпускнікі, студэнты журфака, творчая інтэлігенцыя Беларусі наогул жадаюць шаноўнай Выкладчыцы вялікіх творчых, навуковых, педагагічных і жыццёвых поспехаў.